ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 95 (1062) | ЧАЦЬВЕР, 24-га красавіка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Кошт асобнага №—2 кап.

Пленум Менскага АК ЛКСМБ

28-га красавіка, а 10-ай гадзіне раніцы

АДЧЫНЯЕЦЦА

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА АКРУГКОМУ ЛКСМБ

Дэлегаты вясковых раёнаў павінны быць у Менску 27-га красавіка ўвечары.

Сэкратар АК ЛКСМБ ГАЙДУКЕВІЧ.

Сусьветны пролетарыят рыхтуецца

ДА БАЯВЫХ ПЕРШАМАЙСКІХ ВЫСТУПЛЕНЬНЯЎ

ТЫСЯЧЫ ПРОЛЕТАРАЎ ПАД РЭВОЛЮЦЫЙНЫМІ СЬЦЯГАМІ КОМПАРТЫІ ВЫСТУПЯЦЬ СУПРОЦЬ БЕЛАГА ТЭРОРУ СОЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫХ

Рыхтуецца ўсеагульная забастоўка

ПАРЫЖ, 23. Сход докераў Бордо прыняў першамайскія лёзунгі ўнітарнай конфэдэрацыі працы і компартыі і выказаўся за правядзеньне ў дзень 1-га мая ўсеагульнай забастоўкі партовых рабочых.

У Вэнгрыі забаронены ўсякія першамайскія дэмонстрацыі

ВЕНА, 23. Вэнгерскі міністр унутраных спраў забараніў усякія дэмонстрацыі і сходы ў дзень 1 мая, таксама ў нядзельныя дні за тыдзень да 1 мая і праз тыдзень пасьля першага мая.

Цэргібелі рыхтуюцца

БЭРЛІН, 23. Па паведамленьнях „Лейпцыгер Нэестэ“ ужо вядуцца перагаворы аб забароне комуністычных першамайскіх дэмонстрацый ва ўсёй Нямеччыне.

Зьлёт рабочай моладзі Францыі

Адзіным кіраўніком рабочай моладзі—зьяўляецца комсамол

ПАРЫЖ, 23.—На зьезьдзе рабочай моладзі была прынята першамайская адозва да рабочай моладзі і шэраг рэзолюцый па пытаньнях барацьбы рабочай моладзі. На зьезд зьявіліся і прасілі дазволу выступіць два дэлегаты соцыялістычнай моладзі. Іх мядовыя прамовы аб блізкасьці соцыялістычнай моладзі і комсамолу і прапановы аб скліканьні зьезду рабочай моладзі „без розьніцы політычных напрамкаў“, выклікалі збоку усяго зьезду рэзкі адпор. З заключным словам і з адказам соцыялістычным пасланцам выступіў сэкратар ЦК комсамолу Францыі Кутэйлас, які заявіў, што адзінай організацыяй, якая заслугоўвае давер'е рабочай моладзі зьяўляецца комсамол. Гэтыя словы Кутэйласа выклікалі бурныя авацыі ўсёй залі.

Рэволюцыйнае выступленьне салдат

ПАРЫЖ 23. Па паведамленьнях „Юманітэ“ у лягеры Мурмелон, дзе на паўторным абучэньні знаходзіцца каля 5000 запасных, адбыліся рэволюцыйныя дэмонстрацыі, дзе апошнія 10 красавіка адмовіліся ўдзельнічаць у начных манэўрах. У адказ на загад накіравацца на манэўры, запасныя сьпявалі Інтэрнацыянал.

Жорсткі тэрор супроць рэволюцыйнага руху ў Індыі

ЛЁНДАН, 28. Як талеграфуюць з Бомбею, войскі акружылі 30 паўстанцаў з Вісагонда, якія захоўваліся ў холмах каля гораду. Бенгальскія ўлады забаранілі распаўсюджваньне проклямацый „урбэкстанскай рэспубліканскай арміі“ і адозвы „лігі таварышоў“ індыйскай моладзі.

У Мадраку 1000 рабочых прадпрыемстваў Цюлей, разьбіўшыся на невялікія групы, прыступілі да парушэньня салянога закону. Мосіллал Мэру, часова выконваючы абавязкі старшыні ўсеіндыйскага нацыянальнага конгрэсу, дазволіў членам конгрэсу з цэнтральных провінцый парушаць лясны закон.

У Лудзіяне паліцыя напала на мітынг скліканы ў знак протэсту супроць нецярпімага абыходжаньня з політычнымі зьняволенымі. 50 удзельнікаў мітынгу ранена. Утвораны шматлікія арышты. Адзін з удзельнікаў міруцкага працэсу Вейц вызвален дзякуючы хваробнаму становішчу яго здароўя, прыбыў у Бомбей для лячэньня. Вейц быў сустрэчан з энтузіязмам

Політычныя заключаныя ў Алефарскай турме (Індыя) у тым ліку Мэ Калкуты Сэн Гуката, абвясьцілі галадоўку протэсту супроць гвалту турэмных улад.

Жорсткая крывавая сутычка

паміж комсамольцамі і жандармэрыяй

ВЕНА, 22.—У Колендорфа (прамысловы цэнтр каля Вены) паліцыя забараніла комсамольскую дэмонстрацыю і факальнае шэствіе рабочай моладзі. Забарона мотывіравана тым, што ў гэты дзень адбудзецца царкоўная процэсія. Аднак, ня гледзячы на забарону, з Вены прыбылі ў Колендорф некалькі сот комсамольцаў для удзелу ў дэмонстрацыі. Паміж комсамольцамі і жандарамі адбылася жорсткая сутычка. Дэмонстрантаў удалося расьсеяць толькі пасьля працяглых боек. 7 комсамольцаў арыштавана.

26-га красавіка—юбілей „Чырвонай Зьмены“

Падрыхтоўка да гадавіны распачалася

Пасьля зьмяшчэньня «Чырвонай Зьменай» артыкулу аб тым, што падрыхтоўка да 9-й гадавіны газэты „Чырвоная Зьмена“ па гораду Менску праходзіць нездавальняюча, праца ў гэтым напрамку пачынае зараз шырока разгортвацца амаль на ўсіх прадпрыемствах гораду.

Учора па ячэйках Фрунзэўскага раёну „лёгкая кавалерыя“ ўвесь дзень правярала ход падпіскі на газэту „Чырвоная Зьмена“ і наогул працу яе ўпаўнаважаных.

Першая друкарня рыхтуе паказальны суд над „Чырвонай Зьменай“. Да гэтага мерапрыемства будзе прыцягнуты ТРАМ.

Кастрычнікаўскі раён таксама разгортвае працу па популярызацыі „Чырвонай Зьмены“.

Амаль на ўсіх прадпрыемствах г. Менску пачалася юбілейная падпіска з мэтай выканаць і перавыканаць кантрольную лічбу 30 тысяч экзэмпляраў.

На некаторых прадпрыемствах комсамольскія ячэйкі выносяць пастановы аб 100 проц. падпісцы на „Чырвоную Зьмену“, высоўваючы лёзунг—ніводнага комсамольца, маладога рабочага, колгасьніка бяз „Чырвонай Зьмены“.

Курсы мэдсясьцёр, ня гледзячы на тое, што яны жывуць у інтэрнаце, рашылі выпісаць адну газэту на тры чалавекі.

Па другіх гарадох таксама шырока разгортваецца праца да гадавіны „Чырвонай Зьмены“.

Выязная рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“, якая зараз працуе ў Віцебску, праводзіць належную працу па гадавіне.

У Гомель выехаў прадстаўнік рэдакцыі, каб правесьці ў раёнах Гомельшчыны працу да гадавіны „Чырвонай Зьмены“.

Гадавіну газэты „Чырвоная Зьмена“ патрэбна зрабіць шырокай політычнай кампаніяй.

Падводны флёт імпэрыялістых замест скарачэньня, яшчэ больш павялічваецца. І гэта пасьля таго, як некалькі месяцаў засядала лёнданская конфэрэнцыя „па разьбраеньню“.

(З газэт).

СЛУХАЛІ—ПАСТАНАВІЛІ; — Шчупака пакараць і ўтапіць яго ў моры.

Тав. Кагановіч—сэкратар МК УсеКП(б)

22 красавіка адбыўся IV аб'яднаны пленум МК і МКК УсеКП(б). Аб'яднаны пленум заслухаў паведамленьне таварыша Молатава аб рашэньні ЦК УсеКП(б) ад 18-га красавіка.

Пленум пастанавіў задаволіць просьбу таварыша Баумана аб вызваленьні яго з паста сэкратара МК, абраўшы першым сэкратаром МК—тав. Кагановіча Л. М., які зьяўляецца адным з сэкратароў ЦК УсеКП(б).

Пленум кооптаваў у склад членаў пленуму МК і бюро МК тав. Бельскага. Аб'яднаны пленум прыняў спэцыяльную адозву да ўсіх членаў Маскоўскай організацыі, у сувязі з надыходзячым партыйным зьездам і чарговымі партыйнымі конфэрэнцыямі.

Тав. Кагановіч Лазар Майсеевіч—член УсеКП(б) з 1911 г., да рэвалюцыі вёў партыйную і профсаюзную работу ў Сібіры, Екацярынаславе, Мэлітопалі, Юзаўцы і неаднокраць падпарадкаваўся вобыскам і арыштам. Пасьля лютаўскай рэволюцыі быў старшынёю камітэту партыі і намесьнікам старшыні савету рабочых дэпутатаў у Юзаўцы. Пасьля займаў цэлы шэраг іншых адказных партыйных і профэсыйных пасад.

У 1920 годзе быў назначан членам Турккамісіі УсеЦВК, быў членам Туркбюро ЦК і Наркомам РСІ Туркрэспублікі, пазьней быў членам ЦК гарбароў, членам выканбюро УсеЦСПС, сэкратаром Маскоўскага саюзу гарбароў, а з 1922 году загадваў організацыйна-інструктарскім аддзелам ЦК УсеКП(б). На 12-м зьезьдзе быў абраны кандыдатам, а з XIII зьезду зьяўляецца членам ЦК партыі. З 1924 па 25 год быў сэкратаром ЦК УсеКП(б), а з студзеня 25 году па чэрвень 28 году сэкратаром ЦК компартыі Украіны. З 26 году—кандыдат у члены політбюро ЦК УсеКП(б). Член ЦВК СССР—у сучасны момант працуе сэкратаром ЦК УсеКП(б), членам прэзыдыуму УсеЦСПС і дырэктарам інстытуту права і савецкага будаўніцтва. Аўтар шэрагу работ па партыйнаму і савецкаму будаўніцтву.

Бауман будзе адным з сэкратароў ЦК УсеКП(б)

МАСКВА, 23. У сувязі з вызваленьнем тав. Баўмана ад абавязкаў першага сэкратара МК УсеКП(б) ён пераходзіць на работу ў ЦК УсеКП(б) у якасьці аднаго з яго сэкратароў.

У Нью-Ёрку згарэла 317 зьняволеных

НЬЮ-ЁРК, 23. У турме Огайо адбыўся пажар, у выніку якога 317 заключоных загінула, а 100 паранена. Турма была пабудавана год 40 таму назад і разьлічана на 1.500 чалавек, але ў ёй трымалася звыш 4.000 заключоных. Калі выбухнуў пажар, войскі абкружылі турму і выставілі кулямёты для таго, каб пашкодзіць бегству зьняволеных, хаця апошнія нават і ня імкнуліся ўцякаць. Турэмшчыкі адмовіліся адкрыць камэры, з прычыны чаго шмат хто з заключоных згарэлі.

Забастоўка 4.000

СТОКГОЛЬМ, 23. На 16 папяровых фабрыках абвешчана забастоўка, якая ахапіла звыш 4 тысяч рабочых.

Гадавіна соцспаборніцтва ў Віцебшчыне правальваецца

Учора бюро АК ЛКСМБ узноў заслухоўвала інформацыю райкомаў і буйнейшых вытворчых колектываў аб ходзе падрыхтоўкі да гадавіны соц. спаборніцтва.

Выявілася, што ніякіх зьмен у бок палепшаньня няма. Дырэктывы дадзеныя бюро ад 11-IV—30 г. да комсамольскіх мас не даведзены. Як і раней маса комсамольцаў у праверцы соц. дагавароў ня ўдзельнічае, за выключэньнем адзінак добраахвотна запісаўшыхся ў брыгады па праверцы. Такім чынам Віцебскі комсамол гадавіну соц. спаборніцтва сустрэне без усялякай падрыхтоўкі і конкрэтных вынікаў сваёй работы за год.

Выязная рэдакцыя „Чырвоная Зьмена“.

Будзе праведзена паўторная чыстка

комсамольцаў віцебскага політэхнікуму

(Па тэлефону з Віцебску)

шы райком правяраў правільнасьць замешчанага матар'ялу ў „Чырвонай Зьмене“ пра політэхнікум.

Матар'ялы цалкам пацьвердзіліся. Учора на падставе выяўленага матар'ялу бюро Віцебскага КСМ пастанавіла праведзеную раней чыстку колектыву політэхнікуму адмяніць.

Будзе праводзіцца паўторная чыстка.

Выяздня рэдакцыя „Ч. З.“

Пленум ВСФКБ

24 красавіка, а 6-й гадзіне увечары ў залі пасяджэньняў Савету Народных Камісараў адчыняецца пленум ВСФК Беларусі.

Пасяджэньне комфракцыі там-жа а 5-й гадзіне ўвечары.

ВСФКБ.

На пленуме Магілеўскага АК ЛКСМБ

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЦЦА НА ДВА ФРАНТЫ

—З правым опортунізмам і „левымі“ загібамі і прымірэнцтвам да іх, якія зрываюць правядзеньне ленінскай лініі партыі

Пленум Магілеўскага АК ЛКСМБ адабрыў рашэньне бюро ЦК ЛКСМБ аб палітычных прарывах бюро АК ЛКСМБ і аднадушна асудзіў права-опортуністычную лінію бюро АК. Мобілізацыя энэргіі мас комсамольцаў і працоўнай моладзі на зьнішчэньне меўшых прарываў, на разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі, —неабходныя ўмовы пасьпяховага выкананьня чарговых задач партыі

11 красавіка г. г. адбыўся пазачарговы пленум Магілеўскага АК ЛКСМБ. З дакладам аб рашэньнях бюро ЦК ЛКСМБ і выкананьні Магілеўскім АК ЛКСМБ пастаноў ЦК па пытаньнях вясеньняй пасеўкампаніі выступіў сэкратар Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ тав. Палякоў.

Тав. Палякоў у сваім дакладзе адзначыў, што бюро Магілеўскага АК ЛКСМБ у орыентацыі організацыі па ўдзелу ў вясеньня-пасеўнай кампаніі зрабіла буйную політычную памылку, вызначыўшы, як галоўнае мерапрыемства, збор попелу, ачыстку насеньня, недаацаніўшы работы з батрацтвам і беднатой.

Бюро ЦК ЛКСМБ ацаніла гэта як праяўленьне правага ўхілу на практыцы.

Магілеўскі АК ЛКСМБ па выпраўленьню політычных памылак на грунце рашэньняў ЦК ЛКСМБ нічога не зрабіў, ня гледзячы на паўторныя пастановы ЦК і сыгналы „Чырвонай Зьмены“ аб прарывах у асобных зьвеньнях акруговай організацыі.

Бюро Магілеўскага АК ЛКСМБ у сваім апошнім рашэньні дапусьціла права-опортуністычную памылку, дэзорыентавала організацыю ў пытаньнях росту за лік бядняцкай моладзі.

На Магілеўшчыне маюцца вялікія поспехі ў галіне колектывізацыі сельскай гаспадаркі, але побач з гэтым ёсьць шэраг скрыўленьняў лініі партыі, перагібаў, і момантаў голага адміністраваньня.

Дырэктыву партыі аб ліквідацыі кулацтва як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі, у шэрагу месц скажалі. Былі моманты, калі „раскулачвалі“ серадняка, у чым бязумоўна маецца віна і комсамолу.

Бюро Магілеўскага АК ЛКСМБ з пастаўленымі задачамі пад кіраўніцтву організацыяй у галіне колектывізацыі сельскай гаспадаркі і ў правядзеньні вясеньняй пасеўкампаніі ня справілася. Яно ня здолела мабілізаваць масы комсамольцаў на барацьбу з адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, на барацьбу са скажэньнямі гэтай лініі і перагібамі ў колектывізацыі, аб чым з усёй яскравасьцю гаворыць факт „нейтралітэту“ Шклоўскага райкому КСМ.

Магілеўская організацыя, бязумоўна здольна пры забясьпячэньні належнага чоткага політычнага кіраўніцтва з боку парторганізацыі абранага бюро АК скарыстаць вурокі дапушчаных прарываў, іх ліквідаваць і пасьпяхова выконваць чарговыя партыйныя задачы.

Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі.

Тав. Хведаровіч (сэкратар АК КСМ) зазначыў.—усе памылкі, паказаныя тав. Паляковым у сваім дакладзе і ў рашэньнях бюро ЦК ЛКСМБ, бязумоўна маюць месца ў рабоце Магілеўскага кіраўніцтва. Аб гэтых недахопах я гаварыў і на бюро ЦК і згадзіўся з дадзенай ацэнкай.

Бюро Магілеўскага АК ЛКСМБ зрабіла грубую палітычную памылку—не ўскалыхнула масы комсамольцаў вакол рашэньняў ЦК і АК і само недаацэніла політычнае важнасьці рашэньняў бюро ЦК ЛКСМБ.

Зьмешчаная ў „Чырвонай Зьмене“ перадавіца: „На баявыя тэмпы“ адпавядае сапраўднасьці. Бюро АК гэта ўлічыла і намеціла шэраг мерапрыемстваў па выпраўленьню дапушчаных памылак. Пленум павінен ускрыць усе нашы недахопы з тым, каб мобілізаваць масы комсамольцаў на іх зьнішчэньне.

Тав. Берадзеяў (Клімавічы)—пастанова бюро ЦК ЛКСМБ аб Магілеўскім Акругкомоле бязумоўна правільная. Аб памылках Шклова мы толькі гаварылі, але політычных вынікаў не зрабілі. Неабходна гэтыя памылкі абгаварыць і мобілізаваць усю організацыю на іх выпраўленьне.

Тав. Вайнман (старшыня АПБ) — Політычнай важнасьці задач пасеўнай кампаніі і працы сярод батрацтва і беднаты асобныя комсамольскія організацыі не зразумелі. Мы павінны па-бальшавіцку прызнаваць свае памылкі, але гэтага, на жаль, не зрабіў Хведаровіч, з яго боку няма поўнага прызнаньня сваіх памылак. АК КП(б)Б недастаткова ўдзяляў увагі рабоце комсамолу. Нам неабходна зараз-жа пайсьці ў ячэйкі для шырокага абгаварэньня нашых памылак, стварэньня вакол іх грамадзкай думкі і мобілізацыі мас на іх выпраўленьне.

Тав. Салаўёў (АК ЛКСМБ). У нашай рабоце мы мелі цэлы шэраг прарываў. Я прызнаю сваю асабістую памылку, у мяне была качка ў вызначэньні нашых прарываў. Рашэньні ЦК бязумоўна правільныя. Нам неабходна зараз-жа ўзяцца за выпраўленьне нашых памылак і за вывучэньне вурокаў гэтых памылак. З рашэньнямі па шклоўскай справе мы спазьніліся. Гарорганізацыя вопыт работы па соцспаборніцтву павінна перадаць у вёску.

Тав. Афрыкантаў (прадстаўнік ЦК УсеЛКСМ).— Работа сярод батрацкай і бядняцкай моладзі адсутнічае, неабходна зараз-жа прасунуць у масы апошнія рашэньні партыі ў гэтым напрамку. Трэба ня толькі прызнаваць свае памылкі, але прыступіць да іх хутчэйшага выпраўленьня.

Бюро Магілеўскага АК ЛКСМБ не змагло мобілізаваць масы на работу па выкананьню рашэньняў ЦК ЛКСМБ. Трэба адзначыць, што організацыя Магілеўшчыны здаровая, але кіраўніцтва нездаровае. Неабходна павысіць клясавую баяздольнасьць організацыі.

Тав. Клубман (АК КСМ).—З боку нашых асобных сяброў бюро былі думкі пры абгаварэньні перадавой „Чырвонай Зьмены“, што ў артыкуле больш панікі, чым сапраўднасьці, „Чырвоная Зьмена“ прытрымліваецца прынцыпу „лепш перагнуць, чым недагнуць“. Комсамольская організацыя павінна зараз-жа мобілізаваць усю сваю ўвагу і ўвагу батрацка-бядняцкай моладзі на выкананьне баявых задач, пастаўленых партыяй, вядучы барацьбу на два франты,

Толькі бальшавіцкае прызнаньне сваіх памылак, рашучая барацьба з недахопамі ў нашай рабоце, ёсьць гарантыя таго, што задачы, якія ўскладзены на нас партыяй, мы выканаем.

Тав. Валковіч (АК КП(б)Б).—Зусім бясспрэчны тыя посьпехі, якія мае наша партыя па колектывізацыі ў прыватнасьці і ў нас на Магілеўшчыне.

Аднак мы маем моманты, калі некаторыя партыйцы і комсамольцы захлёстваюцца дробна-буржуазнай стыхіяй, былі выпадкі, калі ў час раскулачваньня зачапілі сераднякоў. Толькі па адным Шклоўскім раёне адменена 80 выпадкаў няправільнага раскулачваньня. Надта слаба праводзілася работа з беднатой. У асобных партыйцаў-комсамольцаў і нават ячэек райкомаў закружылася ў галаве ад посьпехаў, дзякуючы чаму яны забыліся аб клясавай барацьбе і рабоце з беднатой.

Сучаснае становішча парткіраўніцтва комсамолам нездавальняючае, яно павінна быць узмоцнена.

Акрамя таго ў спрэчках выказаліся т. т. Рыбакоў (Чэрыкаў), Сярбаеў (Быхаў), Паўла (Політаддзел), Саладкоў (Касьцюковічы), Маркевіч (Чавусы), Кірэяў (Прапойск). Шыфрын (Чырвонапольле), Каган (Лупалава), Ільліч (Сормавец), Кузьняцоў і Грыцько (АК КСМ), якія з усёй адзінадушнасьцю падкрэсьлілі правільнасьць рашэньняў бюро ЦК аб прарывах, якія меліся ў рабоце кіраўніцтва Магілеўскай акруговай організацыі; адобрыла організацыйныя меры ўжытыя да бюро АК і асобных працаўнікоў.

Ліўшыц.

Стары колгасьнік-брыгадзір з Астрашыцкага-Гарадку ў полі

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ВЫПРАВІЦЬ ПАМЫЛКІ

Рэзолюцыя бюро ЦК КП(б)Б*)

7. Бюро ЦК КП(б)Б лічыць, што пастанова студзенскага пленуму аб колектывізацыі да вясны 1930 г. ня менш 35 проц. яравога кліну не магла даць поваду да неправідловай пастаноўкі пытаньня аб тэмпах колектывізацыі з боку шэрагаў мясцовых парторганізацый. Аднак, гэтая пастанова ў той частцы, у якой яна устанаўлівае тэрмін поўнай колектывізацыі БССР да канца 1931 г.—не адпавядае пастановам ЦК УсеКП(б).

Выходзячы з гэтага, а таксама улічваючы перспэктывы разгортваньня колгаснага руху, Бюро ЦК пастанаўляе зьвярнуцца да пленуму з прапановай зьмяніць гэтую пастанову студзенскага пленуму, паставіўшы задачай правядзеньне поўнай колектывізацыі БССР у точнай суадпаведнасьці з рашэньнямі ЦК УсеКП(б) на працягу пяцігодкі.

8. Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што нашым партыйна-савецкім друкам у пытаньнях колгаснага будаўніцтва былі дапушчаны асобныя памылкі, якія скажаюць лінію партыі ў пытаньнях колектывізацыі. У прыватнасьці „Зьвязда“, як орган ЦК КП(б)Б, як вядучая газэта, пры правільнай у асноўным лініі, дапусьціла асобныя няправільныя установкі (фарсіраваньне тэмпаў колектывізацыі без дастатковага уліку якасьці работы, высоўваньне лёзунга „раскулачваньня — асноўны сродак посьпеху суцэльнае колектывізацыі“).

9. ЦК КП(б)Б рашуча стаў на шлях неадкладнага спраўленьня памылак і скажэньняў у колгасным будаўніцтве, што з усёй сілаю было пастаўлена ў рашэньнях сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б.

Лічучы рашэньне ЦК УсеКП(б) і указаньні, якія знаходзяцца ў артыкулах т. Сталіна, адзіна правільнымі і адкрываючымі шлях да сапраўды прочнага будаўніцтва колгасаў, тым самым да соцыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, ЦК КП(б)Б на сакавіцкім пленуме даў рашучы адпор спробам з боку некаторых мясцовых партыйных організацый (Шклоў і інш.) супраціўляцца выпраўленьню перагібаў і скажэньняў лініі партыі.

10. Бюро ЦК КП(б)Б, канстатуючы, што мясцовыя партыйныя організацыі ў асноўнай масе ужо выпраўляюць дапушчаныя скрыўленьні і памылкі, заклікае яшчэ мацней і рашучай павесьці барацьбу за нямедленае іх выпраўленьне. Хуткае і бальшавіцкае прызнаньне і выпраўленьне памылак патрабуюць узмацненьня бальшавіцкай самакрытыкі, разгортваючы якую усе організацыі КП(б)Б будуць выхоўваць свае шэрагі, будуць бальшавіцкімі тэмпамі рухацца ўперад.

11. Партыя і ЦК дадуць рашучы адпор тым права-опортуністычным і „лева“-опортуністычным элемэнтам, якія імкнуцца і будуць імкнуцца выступаць супроць генэральнай лініі партыі, супроць ленінскага ЦК УсеКП(б). Усякім антыпартыйным спробам, накіраваным да дыскрэдытацыі кіраўніцтва партыі, КП(б)Б дасьць сакрушыцельны бальшавіцкі адпор.

У адносінах усіх супраціўляючыхся выпраўленьню памылак і перагібаў, усіх затрымліваючых разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі, парторганізацыі павінны прымаць рашучыя меры уплоць да выключэньня з партыі, згодна рашэньня сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б.

Спробы тлумачыць адлiў з калгасаў толькі тым, што серадняку ўласьцівы хістаньні, вядуць да затушоўваньня значэньня перагібаў і памылак і пагэтаму ўсе гэтыя спробы павінны знайсьці самы рашучы адпор у шэрагах організацый КП(б)Б.

12. Галоўнай небясьпекай на даным этапе працягвае заставацца правая небясьпека. Партыя павінна мобілізаваць усе свае сілы на барацьбу з спробамі права-опортуністычных элемэнтаў узьняць голаву, скарыстаць скрыўленьні партыйнай лініі для барацьбы з генэральнай лініяй партыі, пад выглядам мнімай барацьбы з „левымі“ загібамі.

Партыя будзе біць з усёй бальшавіцкай няпрымірымасьцю па ўсякім панічным крыкам і правым тэорыям аб „самацёчным“ разьвіцьці колгаснага руху. З асаблівай рэзкасьцю і рашучасьцю неабходна павесьці барацьбу супроць спроб опортуністычных элемэнтаў прадстаўляць нашу барацьбу з перагібамі, як адступленьне ад правадзімай партыяй політыкі соцыялістычнай перабудовы вёскі.

Даючы адпор на два фронты— правым опортуністым, „левым“ перагібшчыкам і „прымірэнчым адносінам да іх, КП(б)Б будзе ў першых шэрагах рашучай барацьбы за генэральную лінію партыі, за ленінскую політыку ЦК УсеКП(б).

*) Канец. Гл. „ЧЗ“ № 94.

Да гадавіны соцспаборніцтв

29-га КРАСАВІКА—ГАДАВІН СОЦСПАБОРНІЦТВА

Засталіся лічаныя дні—узмацнім падрыхтоўк

Энэргаўцы не гатовы

Становішча заводу „Энэргія“ у якім ён быў у першым квартале, якое яшчэ засталося і на другі квартал, магчыма і на трэці павінна зацікавіць грамадзкасьць. У першым квартале завод недавыканаў свой промфінплян на 5 проц., у прыватнасьці вагавы цэх выканаў толькі на 80 проц. Такарны цэх на 64 проц. выпрацоўка крухмальнага абсталяваньня на 37 проц. Такім чынам мы бачым ганебныя невыкананьні прамфінпляну ў першым квартале. Тлумачыцца гэта тым, што прамфінплян ня быў вядом цэхам і асабным рабочым, тэй неорганізаванасьцю, якая панавала на заводзе. Такое-ж становішча было і ў другім квартале, а горш за ўсё гэта тое, што і ў трэцім квартале завод працуе бяз планаў і бяз сыстэмы.

Катастрафічным зьяўляецца пытаньне барацьбы з бракам. Па ліцейным цэху брак даходзіць да 26 проц. і ніякай барацьбы з гэтым ганебным зьявішчам не вядзецца. Ня лепш абстаіць справа і з зьніжэньнем сабекошту. За ўвесь час ён зьніжан на 11 проц., тады як па пляну было намечана ня менш 16 проц. Рабочымі прымаліся некаторыя захады да зьніжэньня сабекошту, былі прапановы некаторых рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, але яны да гэтага ляжаць пад сукном.

Да гадавіны соцспаборніцтв заводзе рыхтуюцца слаба. Пр ёсьць нейкі штаб, у склад ўваходзіць дырэктар, прадстаўн партячэйкі, але сама падрыхт ідзе штабным, габінэтным парад Усяго на заводзе 14 ударных гад у складзе 433 чалавек, ал праўды ўдарна працуюць т 140, а рэшта ніякай ударнай цы не ведзе.

Комсамольскі колектыў ня мае належнага ўдзелу ў падрых ц да гадавіны соцспаборні Новы сэкратар колектыву—Г ман ня ведае колькі на за брыгад і як яны працуюць. Н быўшымся нядаўна сходзе, дз гаварваліся вынікі выкана прамфінпляну і працы удар брыгад, моладзі амаль што ня

Заводу „Энэргія“, і ў пры насьці комсамольскаму колект трэба зрабіць рашучы пера справе сваёй падрыхтоўкі да віны соцспаборніцтва. Заст мала часу, ганебныя лічбы нед кананьня прамфінпляну па быць выпраўлены. Бяз гэтага не апраўдае пролетарскае зва „Энэргіі“.

Віньнікаў Зьм

Гробяць ініцыятыву

Комсамольская ячэйка наборнага цэху першай друкарні да гадавіны соцспаборніцтва мае шмат дасягненьняў. Комсамольцы ўзяліся за давядзеньне прамфінпляну да кожнага рабочага. Меркавалі надрукаваць на асобных паперках конкрэтныя заданьні кожнаму рабочаму на 8 гадз. Пастанавілі застацца пасьля працы і абгаварыць заданьні. Але тут комсамольцы сустрэлі галавацяпскія адносіны адміністрацыі, якая сама нічога ня робіць і перашкаджае іншым весьці гэтую справу.

Ужо шмат часу ко мольцы просяць лічбаў. А ністрацыя кожны дзень кладае і зрывае такім чы добрую ініцыятыву. Я адзін факт: комсамоль комуна наборнага цэху трабавала для сябе прам плян, але дырэктар — Сенчук*—адмовіў у гэтым, жучы, што мы ня мо даваць на кожныя 5 чал прамфіплян. А мы яшчэ ворым аб тым, каб ко рабочы меў у сябе зада на 8 гадзін працы. Вядо справа,—пры такой заці ленасьці з боку адмініст цыі наборшчыкі ня змо ліквідаваць прарыву набо га цэху.*

Л.

Ганебныя 15 павін быць зьнішчаны

На галянтарэйнай фабрыцы „ ларуска“ (Менск) падрыхто праца да гадавіны соцспаборні ідзе чарапашым крокам. Сярод партыйных рабочых не вялася вядзецца растлумачальная прац значэньні соцспаборніцтва. Бес тыйныя нават ня ведаюць, кал та гадавіна і для чаго яна па на. Да гадавіны соцспаборні ячэйка КСМ галянтарэйнай фа кі вылучыла камісію з 6 асоб, павінны ўзяць на сябе аба падрыхтаваць вечар на 29 кр ка, дзе будзе вырашацца пыта як комсамольцы праводзілі працу сярод беспартыйнай мол што зроблена імі па ўцягв беспартыйных у шэрагі КСМ. фабрыцы організавана ўдарная гада комсамольцаў, якая прац лепей астатніх. Яна носіць назву для таго, каб толькі ліцца перад астатнімі, а на справе праца брыгады падзвы дрэнная. Замест таго, каб уця у групу ўдарнікаў новых ра яны адгаварваюць іх, кажучы: **што вам уступаць у бры калі вы і бяз гэтага пра це**“. Гэта робіцца ў той час, фабрыка „Беларуска“ недавык на 15 проц. прамфінплян.

Булькот

ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

Ал. Пруднікаў

Асінбуд

…лі ня сьнілі нават,
…марылі гаі
…велічы і славе
…акрыўджаным краі...
…сьці тут ураньні,
…тумане дымавым
…мелі на курганах
…піва, ды палын.
…сьці тут блудзілі
…ілеты ціішыні,
…ечны сьпеў ідылій
…эптах іхных нік...
…ы на дол кладуцца
…восеньню званец...
…поха, сіл, індукцый.
…урмуе ў шасьцярні...

І сёньня у пшаніцах
на радасных палёх
электра сьвечмі мгціцца
У тысячах кулон...
Драты нітуюць поле,
Кіпучых сіл простор—
Такую сёньня долю
Сустрэў савецкі торп.
Мільёны рук адзіных
Трымаюць дзён вагар...
Энэргій мчацца дзіны
У горад і ў колгас...
Палі ня сьнілі нават,
Ня марылі гаі,
Што ў электрычнай ляве
Балота забруіць...

М. Процька

ТЭМПЫ

У волатах-тэмпах
Напружанай працы
Мінаюцца творчыя дні.
Што сёньня зрабілі
Для нас яшчэ мала
Уперад—імкненьні адны!

Імчацца няспынна
Жаданыя тэмпы
Цэмэнтам мацуецца рост
Шляхі упрыгожаны
Шпаркай будовай
І грукатам новых калёс.

Чырвоныя постаці
Вежаў цагляных
Уздымаюцца стромка увысь.

Ўзрастаюць заводы,
Гракочуць машыны,
Якіх ня было тут калісь.

Ўквячаецца горад
Гранітнай махінай,
Расьце за сьцяною сьцяна.
У палявых прасторах
Скрыгоча машына
І межы руйнуе яна.

Цяпер, калі лемеш
Сталёвай машыны
Ўзьдзірае адвечны дзірван,
Зьнішчаюцца путы
Старых перажыткаў—
За плянам выконваем плян·

Зьм. Сяргеевіч

* * *

Вясна, вясна!
Крынічаць ў даль жаданьні,
І жар грудзей
Маіх не затушыць,
Бо меж няма
Вялікім рыштаваньням
У вышыню
І залатую шыр.
Вакол, вакол,
Куды ня кінеш вокам:
Муры, муры,
Чырвоныя муры.

І у грудзёх затым вось,
Ненарокам,
Будоўлі жар
Палаючы гарыць.
І я пяю
Ўсёй гучнасьцю гартані...
Пяю, пяю
І буду заўжды пець
Пра шыр-размах
Вялікіх рыштаваньняў
І пра муроў чырвоных
Пунсацьвець.

Аннібалава прысяга

(Апавяданьне)

Пралётка, у якой сядзеў Пятроў, ціха і плаўна раскачвалася. Мільгалі шэрыя абрысы дамоў, засланяліся шырокай сьпіной звозчыка. Ярка гарэлі рознакалёрныя лямпачкі на ўрадавых дамох. Па тротуарах соваўся шумны і сьвяточны натоўп. Здальку, заглушаныя грохатам і шумам гораду, даносіліся адрыўкі сьпеваў Інтэрнацыяналу. Барвяны водбліск паходняў клаўся паўзьверх галоў натоўпу, запальваючы кітайковыя сьцягі трапятлівымі агнямі.

Пятроў напоўсядзеў у пралётцы і сярдзіта, скоса пазіраў на ўспыхваўшы агоньчык сваёй папяросы. Ён адчуваў сябе дзіўна адарваным ад агульнага жыцьця гораду, непатрэбным і бескарысным, як пажаўцелы і апалы ліст.

Гадзіну таму назад на фабрычным сходзе ён упяршыню адчуў гэту дзіўную адарванасьць ад агульнага жыцьця. Ён расказваў шматлюднаму сходу свае ўражаньні аб барацьбе з юнкерамі каля Нікіцкіх варот. Пятроў разматваў напоўзабыты клубок падзей. Адзін успамін выклікаў другі, больш яркі.

Вось ён ляціць сагнуўшыся ўздоўж фронту Арбацкіх асабнякоў. Яшчэ бадай хлапчуком у шэранькай шынэлі, купленай на Сухараўцы ў інваліда-салдата, а за ім узьдагон, як ганчакі, нясуцца два юнкеры...

Хвалюючыся, ахоплены сваімі ўспамінамі, зноў перанесены ў эпоху славутных боек, Пятроў расказваў, радуючыся былым перамогам.

Раптоўна за сьпіною сваёй Пятроў пачуў ціхі і сярдзіты голас комсамольца Элікава.

— Бач, як запеў! Салоўкай заліваецца...

Гэты сярдзіты голас прымусіў Пятрова настаражыцца. Ен адразу, неяк нутром, зразумеў, што гэта адносіцца да яго.

— Некалі на барыкадах біўся, а цяпер... з шахцінцамі.., за адно з шахцінцамі!..

— Ты, Саша, пераўвялічваеш—у адказ раздаўся голас Бадаевай, шэравокай комсамолкі,—па мойму Пятроў падпаў пад уплыў... Ён—суб'ектыўна чэсны...

І, як гэта заўсёды бывае, калі няясныя да самога апавядальніка, хвалюючыя і амаль забытыя ўспаміны абрываюцца ўмяшаньнем сьвежых дражлівых і больш блізкіх думак, Пятроў страціў нітку свайго расказу, і тое значнае і вялікае, аб чым зьбіраўся ён расказаць, засталося нерасказаным.

Ён глянуў на мора чалавечых галоў і гэта дзівоснае чалавечае мора здалося яму чужым і непатрэбным.

Крыўднае, мімалётна схопленае слова, вывела Пятрова са звычайнай роўнавагі. Перад вачымэ, засьцілаючы людзей, насілася гэтае крыўднае слова, прымаючы бязладна—недарэчныя матар'яльныя вобразы.

— Не,—я ня шахцінец,—упарта цьвердзіў ён самому сабе; ён ня мог усприняць усяе глыбіні зьнявагі, ня ўспрымаў яе з глыбіні.— Аркадзь Паўлавіч ня вінен... і ніхто ня вінен... Абсталяваньне заказвалася ў некалькіх чужаземных фірм. Гэтым тлумачыцца, што транспортэр Штоца недапасаваны да дызэляў Вігера... І падача ў рубільныя патроны дроў і балянсаў патрабуе ўжываньня ручной сілы... Не, Аркадзь Паўлавіч нявінны!..

Калі Пятроў упяршыню сустрэўся з Аркадзь Паўлавічам у заводзкай канторы, ён здаўся Пятрову напоўдзіў знаёмым і гэта яго няпрыемна пакарадзіла. Можа быць недзе ў тайніках пямяці хаваўся адбітак няпрыемнага снавідзеньня. З часам, у сумеснай працы, гэта ўражаньне зьнікла.

Але дзіўна! Чым больш зьбліжаўся Пятроў са сваім галоўным інжынэрам Аркадзь Паўлавічам, тым з большай падазронасьцю і халоднасьцю адносіліся да яго рабочыя. Раней бывала, адчуваючы ў ім чалавека свае клясы, рабочыя па-просту зьвярталіся да Пятрова за парадай, а ў вачох кожнага Пятроў чытаў, што яго любяць, паважаюць і давяраюць яму.

Аднойчы, нейкі рабочы з кіслотнага аддзяленьня нагнаў яго на вуліцы, моцна пацісную руку і даверліва, як блізкаму сябру, расказаў сваю сямейную драму.

З вёскі прыехаў бацька... Жыў у яго. Выпадкова выявіў, што бацька мае любоўныя зносіны з жонкай. Прагнаў бацьку. Хацеў прагнаць і жонку... Але пакінуў.

— Вось вы, тав. дырэктар, параіце, як быць? Двое хлапчукоў.

Пятроў замяшана мармытаў у адказ, што „снахацтва"—перажытак старога сямейнага ўкладу, заснаванага на паднявольным становішчы.

Яго замяшала і абрадавала даверлівасьць, з якою гэты рабочы, якога ён бачыць толькі другі раз у сваім жыцьці, расказаў сваю інтымную драму.

Але цяпер становішча зьмянілася. Ён яўна чытаў у вачох рабочых недавер'е к сабе, разумеў прычыну гэтай перамены. Але ён ня мог асіліць сябе і парваць з Аркадзь Паўлавічам, з яго сястрой Верачкай. Верачка часта здавалася Пятрову пяшчотным залацістым матылёчкам.

Залатыя валасы Верачкі, пах ахмяляючай парфумы зачаравалі Пятрова. Яшчэ хлапчуком, пры спатканьні з дзяўчынамі з чужога недаступнага сьвету, гублялася нянавісьць да іх, да клясы, да якой яны належалі.

Пралётка раскачвалася і плыла па высланай калодачкамі вуліцы, як па вадзе. Шырокая сьпіна звозчыка веяла цяплынёю, засланяючы сустрэчны вецер. Конь бадзёра і выразна цокаў капытамі. Пралётка раптам затрымалася. У задуменьні Пятроў адразу не заўважыў астаноўкі.

—Прыехалі,—паведаміў звозчык.

Пятроў пасьпешна выскачыў з пралёткі, парыўся ў кішэні і, не азіраючыся нырнуў у калітку.

Аленін

(*Працяг будзе*).

Рыгор Казак

Хто румзае?

Прасторы, даліны і тракты—шляхі
Асыплем прыгожымі ружамі.
Мы выйдзем жыцьцё уздымаць на
штыхі
Ня скажам: мы цяжар ня ўздужалі.
Мы—сіла вякоў
Мы—жыцьця рубакі.
Стагодзьдзя ў бярвеньні
расколаты...
Падмурак падкладзен,
Забіты цьвікі
Упартым бязьлітасным молатам.

Хто румзае? Эх, вы...
Нам вера дана
У будучынь радасна-блізкую.
Дарога дапраўды ёсьць толькі
адна,—
Ня пойдзем на брудную, сьлізкую
Жыцьцё-ж ня бывае без цяжкіх
прыгод.
Зірнеце,—сьцягі над саюзамі
Гавораць, што шмат пабудуюць
пяць год!
Эй, хто там цудліва зарумзаў?

Па каляінах творчасьці

(Па матар'ялах, дасланых у рэдакцыю)

…акцыя штодзень атрымлівае шмат …р'ялаў літаратурнае творчасьці па…очых пісаць. Моладзь шмат пі… …Сярод кіпы лістоў вы знойдзеце …ткі цэлых зборнікаў п'ес, апавя…няў і г. д. Але найбольш,—гэта …ванае творчасьці. Здавалася-б, і добра. Чаго-ж больш хацець? …дзь піша, а справа рэдакцыі дру…ь. Але і ў тым і справа, што дру…ь дык якраз амаль і няма чаго, …род твораў гэтае творчасьці вельмі рэдка сустракаюцца творы, …б хоць з большага несьлі адзнаку …цкае творчасьці. Большасьць-жа …а матар'яну складаюць няпісьмен…неапрацаваныя. як з боку фор…на-мастацкага, гэтак і з боку по…чна-ідэйнага, вершы, якія прыхо…а, як макулатуру здаваць у ар…

…чынаючы пісаць, неабходна раз …усёды ўсьвядоміць, што пісьмень…я праца—вельмі і вельмі складаная, цяжкая і патрабуе па-першае—…ай падрыхтоўкі, галоўным чынам …іх ведаў, асьветы, па-другое—но…дна мець і пэўны прыродны нахіл, …насьць да гэтае працы. Гэта пра…ачна больш складаная і цяжэй…чым якая іншая праца Па…ючым раз назаўсёды неабходна …уць думку, што варта мець міні…ную адукацыйнасьць, асьвету, … хоць крыху пісьменным і, захацеў,—стаць пісьменьнікам, а для …а даволі напісаць пару-другую …аў, як ужо і пісьменьнік. Не, …ышы! Перш, чым пісаць вершы, …дзі неабходна ўсю энэргію пера…на вучобу. Вучыцца, вучыцца і … раз вучыцца—вось запавед, які …віў Ул. Ленін моладзі. І толькі … гэткім шляхам, ня спыняючы ву…і, меўшы ўжо даволі значныя … політычную адукацыю, можна …баваць свае сілы і пяром. Толькі з …іх колаў выйдуць больш здольныя …кі моладзі на шлях пісьменьніцкае …ы, на шлях, зноў паўтараю, цяжкі, складаны, які патрабуе ведаў, працы і працы.

А мы цяпер часта маем зусім нездаровую зьяву, што часта вучань сямігодкі, ня маючы і мінімуму патрэбных ведаў, захапіўшыся вершапісаньнем, закідае вучобу, лекцыі і марна губіць энэргію і час на бескарысны як для яго, так і для грамадзкасьці занятак. З такім зьявішчам патрэбна пакончыць. Патрэбна яшчэ запамятаваць, што мастацкая літаратура, гэта не якая-небудзь забава, цацка для гульні ў вальнейшы час, а сродак арганізацыі і накіраваньня думак, пачуцьцяў і ўсяе псыхікі чытача ў напрамку карысьці соцыялістычнаму будаўніцтву, на шлях службы апошняму.

Мастацкі твор, у прыватнасьці верш, павінен захапляць чытача, накіраваўшы яго энэргію, імкненьні, да таго клясавага змаганьня, якое адбываецца ў савецкай краіне, запаляючы пролетарскай няпрымірučасьцю да клясавага ворага і ўзбуджаючы ў яго (чытача) энэргію да соцыялістычнага будаўніцтва, якое з вялізарным посьпехам праводзіцца пролетарыятам у моцным саюзе з бядняцка-серадняцкім сялянствам і пад непасрэдным кіраўніцтвам камуністычнай партыі вядзе да соцыялізму. Вядома, што гэткую функцыю верш зможа выконваць толькі тады, калі ён будзе насычан тым патосам, уздымам, рытмам, энэргіяй і тэмпам, якімі адбываюцца соцыялістычныя процэсы. Каб лепш гэтым патосам узьдзейнічаць на пачуцьці і думкі чытача, верш павінен быць апрануты і монолітна зьліты з высокамастацкімі вобразамі, мэтофорамі, параўнаньнямі, эпітэтамі адпаведным разьмерам і г. д. Інакшай кажучы,—у вершы, як яго ідэя, так і форма, у якой чытачу перадаецца гэта ідэя, павінны быць між сабой непарыўна зьвязаны, мець адзінства, монолітнасьць, бо першая—у вершы ня мае вартасьці бяз другое і наадварот.

Пачынаючым неабходна памятаваць, што рэдакцыя друкуе з вялікіх кіпаў матар'ялаў толькі самае лепшае, самае апрацаванае, як з боку ідэолёгічнага, ідэёвага, так і, у сувязі з гэтым, з боку формальна-мастацкага, тэхнічнага. Пераважная-ж большасьць вершаў прысылаемых у рэдакцыю, не адпавядае нават і мінімуму патрабаваньняў. Шмат вершаў і зусім ня маюць адзнакі вершаванае творчасьці. Часта малады аўтар думае, што варта толькі расставіць словы ў радкі, прычым словы падабраць ідэолёгічна-вытрыманыя, як ужо верш і гатоў. Прыклад гэтага нагадвае верш Каменскага „Вясна індустрыі":

„У часе войстрай
Барацьбы:
З ухіламі
У партыі
Прышла вясна індустрыі
У часе барацьбы
Між клясамі"

Як бачым, гэтыя радкі, думаю, зусім не нагадваюць вершу, бо ні рытму, ні рыфмы, ні вобразу няма. Гэта звычайныя словы, якіх аўтар начытаўся з перадавіц газэт. Напісаўшы гэтыя словы, звычайна адно за другім, як пішуцца простыя сказы, мы атрымаем толькі няўдалы, сапсаваны няпісьменнасьцю аўтара лёзунг. Тое-ж, к прыкладу, і ў вершы „Лявоніха"—Баравога:

„Мы дагэтуль досыць бедна жылі
Як асобна гаспадарку вялі:
Бо ў полі дрэння збожжа расло
Харчаваньня і на зіму ня было".

Бязумоўна, каля мастацкае творчасьці такая пісаніна і не начавала. Поэта, хоць-бы сабе і гэтымі самымі словамі, на конкрэтызаваным паказе жыцьця, вобразамі, непасрэднай мастацкай праўдаю, а не агульнымі няўмела скарыстанымі агітацыйнымі фразамі,—узбудзіў-бы ў чытача пачуцьцё і імкненьне будаваць колектывістычную гаспадарку. А словы Баравога не выклікаюць ніякага сьледу ў думках і пачуцьцях чытача, бо аб гэтым-жа значна лепш, паўней і пераканаўча болей сказана ў перадавіцах любой газэты. Гэты сьлед, ці характар голай агіткі, маюць большасьць дасылаемых у рэдакцыю вершаў.

(*Працяг будзе*)

Рабочыя прапануюць

выдаць мільённым тыражом лепшыя вершы і поэмы Ул. Маякоўскага

ВАРОНЕЖ. У Варонежы адбыўся агульна-гарадзкі жалобны вечар памяці Маякоўскага. На в е ч а р ы прысутнічала звыш 400 рабочых, работнікаў мастацтва, журналістых і прадстаўнікоў культурных грамадзкіх організацый. Адзначыўшы вялікую ролю Маякоўскага ў рэвалюцыйным мастацтве. рабочыя прапанавалі ВЫДАЦЬ ЛЕПШЫЯ ВЕРШЫ І ПОЭМЫ ПАМЕРШАГА ПОЭТЫ ТАННЫМ МІЛЬЕННЫМ ТЫРАЖОМ І ПРАСУНУЦЬ У ШЫРОКІЯ РАБОЧЫЯ МАСЫ. Рабочыя прасілі папулярызаваць творчасьць Маякоўскага. У заключэньне артысты вялікага савецкага тэатру выступілі з чыткай вершаў Маякоўскага. Чытка зрабіла вялікае ўражаньне на рабочую аўдыторыю.

Выстаўка Маякоўскага за 20 год

Маякоўскі на выстаўцы адказвае на запытаньні экскурсантаў

ЖЫЎ ГОГАЛЕЎСКІ ГАРАДНІЧЫ!

Аб стане разгортваньня самакрытыкі ў менскай чыгуначнай дзевяцігадовай школе МББ

Аб становішчы самакрытыкі ў чыгуначнай школе МББ імя Чарвякова могуць гаварыць наступныя „прынцыпы“ члена партыі і загадчыка школы тав. Цмыха.

Папершае, тав. Цмых лічыць, што самакрытыка ня мае ніякіх адносін да акадэмічнай пасьпяховасьці наогул і да прарываў у гэтай школе (23 проц. непасьпяховасьці)—у прыватнасьці.

Па-другое, што самакрытыка рэч ня новая, яна (самакрытыка) была і ў старой пэдагогіцы і дыдактыцы і па думцы Цмыха звodзіцца да таго, што „трэба развязаць вучню язык“.

Далейшая лёгіка цмыхаўскіх „прынцыпаў“ прыводзіць да таго, што хаця язык вучню развязалі, але дзеля таго, што самакрытыка ня мае адносін да акадэмічнай працы, дык па акадэмічных пытаньнях вучні „суждения иметь не смеют“, а таму, у парадку адзіначальля, Цмых не дапускае ніводнага вучня на вытворчую нараду. У даным выпадку мы маем на ўвазе адзначыць факт, што на вытворчую нараду, якая адбылася 16-IV—30 г. на загаду Цмыха не было дапушчана ніводнага вучня, нават комсамольца, ні старшыні школькому. Мы апушчаем тое, што гэтая нарада зьвяла сваю дзейнасьць выключна да абмеркаваньня артыкулу „Чырвонай Зьмены“, а гэта, у сваю чаргу, можа прывесьці да думкі, што пад шыльдай нарады стваралася грамадзкая думка з тым, каб больш адзінадушна выступіць супроць самакрытыкаў, якія, напрыклад цмыхаўскім „прынцыпам“, адважыліся напісаць у „Чырвоную Зьмену“ артыкул аб прарывах у школе. Ня інакш, як толькі па гэтай прычыне не дапусьцілі вучняў на „вытворчую нараду“.

На шэрагу сходаў, якія праведзены камісіяй па агляду школы, мы вы чулі ад настаўнікаў амаль ніводнага слова, што ў школе з самакрытыкай ня ўсё добра. Але нам удалося высьвятліць шэраг фактаў, якія сьведчаць аб тым, што ўсімі мерамі душыліся ўсялякія імкненьні вучняў крытыкаваць тыя ці іншыя школьныя учынкі настаўнікаў.

Чым, як—не зацiскам самакрытыкі можна назваць такі факт: комсамолец (вучань) Сяліцкі імкнуўся на школьнай радзе крытыкаваць мэтады выкладаньня белмовы настаўніцы Фідроўскай,— яму заявілі: „Яйцо курыцу не вучаць“.

Чым, як ня імкненьнем зачыніць рот, можна назваць і такі факт, калі вучні 8-й клясы імкнуліся давесьці няправільнасьць установкі Фідроўскай аб тым, што „мы тысячамі беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры адбіраем ідэолёгію ад кулака, настаўнік Путнін, не жадаючы разабрацца па сутнасьці справы, заяўляе: „Фідроўская—найлепшая марксістка і вас, вучняў, трэба ўзгрэць“.

У зьвязку з гэтым, Путнін нават на сходзе заявіў: „я не дазволю вучням крытыкаваць мае палітычныя ўстаноўкі“.

Цікава, з якога гэта часу стала, хто даваў такія „ўстаноўкі“, каб у савецкай школе вучань ня меў права выступаць супроць яўна няправільных, палітычна - шкодных „измышлений“ асобных настаўнікаў?

Аб тым, як асобна настаўнікі „любяць“ самакрытыку, якая ідзе ад вучняў і як уяўляюць яны сабе гэтую самакрытыку, можа сьведчыць характарыстыка „нового вучня“, якую даў настаўнік Зарубін на вышэйпамянёнай „вытворчай нарадзе“. Тав. Зарубін заявіў, што „цяпер нарадзіўся новы вучань з страшэнным вачыма“.

Такім, бачыце, страшэнным здаецца вучань, які „смеет иметь суждение“ аб сваіх настаўніках.

Толькі дзякуючы такім адносінам да самакрытыкі „сьмяльчак“—вучань Сялецкі—хацеў пакончыць самагубствам і ўрэшце быў прымушан пакінуць школу.

Нельга прайсьці міма абураючых фактаў „барскіх“ адносін асобных настаўнікаў да друку—гэтага магутнага вагара у разгортваньні бальшавіцкай самакрытыкі.

На старонках „Ч. З.“ у ранейшым артыкуле мы расказвалі пра адзін з фактаў „благароднага“ абурэньня настаўніка Путніна па адрасу „Ч.З.“, якая „адважылася“ крытыкаваць дрэнныя паводзіны настаўніка.

Мы супыняемся на гэтым факце таму, што гэта—невыпадковасьць, гэты факт—не адзіночны, мы маем цэлую сыстэму бурклівa „абывательскіх адносін да друку з боку асобных людзей, якія органічна не могуць пераварыць самакрытыку, асабліва калі самакрытыка сваім жалам накіравана на іх і ім падобных.

Атрымаўшы ў вышэйпаказаным выпадку адпаведную кару па партыйнай лініі, тав. Путнін, здавалася, павінен быў-бы праўляць партыйную чуласьць да самакрытыкі і у прыватнасьці да крытыкі, якая ідзе праз друк, але для Путніна, як відаць, „мора па калені“.

Падамо некалькі фактаў:

Ня так даўно ў „Ч.З.“ быў зьмешчан артыкул аб тым, што па ініцыятыве вучнёўскай організацыі ў школе імя Чарвякова былі організаваны суботнік, сродкі ад якога павінны пайсьці на закупку трактара для колгасу, але на гэты суботнік не зьявіўся амаль ніхто з настаўнікаў. У час разбору гэтай заметкі на пэдрадзе, Путнін настойваў на тым, што патрэбна „прызнаць нататку няправільнай, бо... настаўнікі не ведалі, што будзе суботнік“.

Як бачыце,—галава не ведала, што рукі робяць. Супроць гэтай пастановы выступалі і галасавалі на пэдрадзе толькі прадстаўнікі школьнай самаорганізацыі і комсамольскай ячэйкі. Разам з тым нам удалося даведацца, што Путнін, ведаючы аб суботніку, сам не пашоў і другім ня раіў, „так як это будзе хвастызм“(?!)

Аб тым, як разумеюць асобныя настаўнікі ролю насьценгазэты ў разгортваньні самакрытыкі ў школе, можа сьведчыць хаця-б такі факт:

Настаўнік Цвырко ў часе заняткаў, бачачы дрэнныя паводзіны асобных вучняў, замест таго, каб ужыць рашучыя захады да бузацёраў, пачаў вырашаць справу „дэмократычна“, паставіўшы на галасаваньне вучняў гэтай клясы пытаньне: „ці вывесьці бузацёра з клясы, ці пакінуць“. У газэце, як і належала чакаць, зьявілася нататка, крытыкуючая такія архі-„дэмократычныя“ мэтады ўздзейнічаньня. Пасьля гэтага Цвырко абураецца: „як гэта так? Калі я ўжываў выраз ВОН—крытыкуюць, паставіў на галасаваньне—таксама крытыкуюць“.

Да рэчы кажучы, гэта—ж насьценнай газэце давялося крытыкаваць словы „падла“, „зараза“, якія ўжываліся настаўнікамі Сьпірунеўскім і Зарубіным да вучняў.

Ня трэба дадаць, што на групе вышэйсказанага, па думцы Цвырко, насьценгазэта з сваёй самакрытыкай гэта і ёсьць той зло, што ставіць палкі ў шпіцы мэтаду ўзьдзейнічаньня на вучняў „выхавальнікаў“ тыпу Цвырко.

Асаблівую ўвагу заслугоўвае факт, як некаторыя настаўнікі імкнуліся свае асаблівасьці ХВАРОБНАГА РЭАГАВАНЬНЯ НА САМАКРЫТЫКУ ПРЫВІЦЬ—ВУЧНЯМ, ствараць думку сярод вучняў, што „самакрытыка, як дышла,—куды павярнуў туды і вышла“.

Толькі з такога пункту погляду патрэбна апэньваць паводзіны настаўнікаў Путніна і Фідроўскай, якія пасьля зьяўленьня ў „Чырвонай Зьмене“ артыкулу „Прарывы ў чыгуначнай школе МББ імя Чарвякова“ і артыкулу ў „Зьвязьдзе“—„Ня трэба блытаць“, замест заняткаў на лекцыях, заняліся разборам абодвых артыкулаў. На пытаньне вучняў, які артыкул правільны, Путнін адказаў: „Сталін сказаў, што калі ёсьць 5 проц. праўды, значыцца праўда і трэба аб гэтым пісаць, але бачыце, калі ёсьць толькі 1 проц. праўды“, а для таго, каб вучні лепш уясьнілі пункт погляду Путніна, ён дадае: „У нас у свой час хадзілі чуткі, што настаўнік у час заняткаў цалаваў вучаніц, але, як вам вядома, высьветлена, што гэта—плёткі, так можа (?!) быць і з артыкулам „Ч. З.“

Нам невядома, як „тлумачыла“ артыкулы Фідроўская, нам толькі вядома, што яе імкненьне ствaрыць грамадзкую думку сярод вучняў сустрэла з іх боку абурэньне, але Фідроўская „ня з тых простых“, каб лічыцца з думкамі вучняў; яна, узьняўшы тон, заяўляе: „Мая лекцыя і я што хачу, тое і раблю“.

Думаем—комэнтарыі не патрэбны для таго, каб зразумець увесь зьмест чыннасьці гэтых „выхавальнікаў“.

Ня будзем гаварыць і аб злачынстве, якое формальна рабілі гэтыя людзі, скарыстоўваючы гадзіны акадэмічных заняткаў для таго, каб выказаць сваю злосьць па адрасу самакрытыкі, якая для іх прыносіць толькі няпрыемнасьці і парушае абывательскі спакой.

Скажам толькі адно—асноўных фактаў з артыкулу „Ч. З.“ „Аб прарывах у чыгуначнай школе МББ імя Чарвякова“ ніводзін з настаўнікаў, у тым ліку Путнін і Фідроўская, не абвяргнулі.

У зьвязку з гэтым міжволі ўспамінаюцца словы гараднічага з „Рэвізора“:

„Мала таго, што пойдзеш у пасьмешышча — знойдзецца шчэлкапёр, папяровы пэцкаль, у комэдыю цябе ўставіць. Вось што крыўдна! Чыну-званьня не пашкадуюць і будуць усе скаліць зубы і біць у далоні. Эх, вы! Я-б усіх гэтых пяпяровых пэцкаляў! У, шчэлкапёры, лібэралы праклятыя! Чортава насеньне! У вузел-бы вас усіх завязаў, у муку-б сьцёр вас усіх, да чорта у падкладку!“

На вялікі жаль усё-ж прыходзіцца констатаваць, што і на сёньня дзе-ні-дзе застралі гогалеўскія гараднічыя, якія маскуюць свой твар пад шыльдай савецкага настаўніка.

ВАСІЛЬ ГЛУСКІ.

Чырвонаармейцы вучаць стралаць комсамольцаў

30000 падпісчыкаў павінна мець газэта на май месяц!

Ячэйкі ЛКСМБ, упаўнаважаныя, чытачы, юнкоры!

Праверце, хто ў вас на прадпрыемстве, установе, колгасе ня выпісвае „Чырвонай Зьмены“.

Уцягнеце іх у лік 30000!

Пяць гадзін прастою

22-га красавіка г. г. 23 рабочых нацiжнага аддзяленьня мехабутковай фабрыкі прастаялі 5 гадзін. Было гэта па віне скурсыкату, які вельмі дрэнна забясьпечвае фабрыку неабходным матэр'ялам. Дырэкцыя фабрыкі яшчэ 5-га красавіка папярэджвала скурсындыкат недахопе стабаліну, але з яго боку ня было ніякага конкрэтнага агаваньня.

Назіраецца цэлы шэраг прастояў, дзякуючы недагляду тэхперсаналу за машынамі. Напрыклад, можна прывесьці такі выпадак,—калі днях сапсавалася адна частка вінтавое машыны, дык замест таго, каб аднесьці яе на завод паправіць і пусьціць у ход, яе пакінулі і машына на сёньняшні дзень вышла з строю. Таксама адчуваецца вялікі дахоп у скуровачнай паперы, малаткох, голках для машын, што таксама выліваецца ў прастоі.

Бюро партыйнага колектыву занялося гэтым пытаньнем і вылучыла камісію для ўстанаўленьня і выяўленьня вінаватых у гэтай справе. РСІ павінна зараз-жа заняцца гэтым пытаньнем, каб знайсьці тых, хто перашкаджае нам выконваць промфінплян.

С. Кацэнэльсон.

Увага! Увага! Увага!

26-га красавіка, а 6-ай гадзіне увечары, у памяшканьні дому Працасьветы, Фрунзэўскі РК ЛКСМБ склікае конфэрэнцыю беспартыйнай рабочай моладзі Фрунзэўскага раёну.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Удзел рабочай моладзі ў соцыялістычным будаўніцтве (дакл. т. Будзінскі).
2. Садаклад РК ЛКСМБ (дакл. т. Старобінец).
3. Аб вытворча-бытавых комунах (дакл. т. Харкоў).
4. Дакл. журыйнай камісіі па прысуджэньню пераходнага сьцягу ВСНГБ (дакл. тав. Каждан).

Ячэйкі ЛКСМБ павінны зараз-жа на пашыраных сходах моладзі абраць дэлегатаў на конфэрэнцыю. Модус—адзін ад пяці.

Паведамленьні

26-IV—а 7-ай гадзіне ўвечары, у клюбе Карла Маркса адзецца ўрачыстае адчыненьне ФЗВ швэйнікаў. Усе прынятыя ў школу ФЗВ вучні павінны атрымаць білеты ў памяшканьні школы (Ленінская 11 ад 10 да 3-х гадзін дня 25-га і 26-га красавіка)

Сёньня а 6-ай гадзіне ўвечары у памяшканьні ФРК ЛКСМБ адбудзецца пасяджэньне конфлiктнай камісіі ФРК ЛКСМБ.

Сходы чытачоў колгасьнікаў і селькораў газэты „Трактар“ Койданаўскага раёну

26-га красавіка, а 6-ай гадзіне ўвечары, у м. Койданаве, у колгасе Станькова, Вертіпкі і Негарэлае склікаюцца кустовыя сходы чытачоў, колгасьнікаў і селькораў раённай газэты „Трактар“, а таксама запрашаюцца ўсе селькоры, насьценкоры і рэдколегіі насьценных газэт.

Колгасы і паселішчы разьмяркоўваюцца наступным парадкам: Да Койданаўскага куста прымацоўваюцца ўсе койданаўскія ячэйкі і сельсаветы Бараўскі, Старынькаўскі і Макаўчаўскія сельсаветы і комуна „Чырвоны Сьцяг“.

Да Станькаўскага куста: Ляхавіцкі, Дабрынёўскі с-с., Вільчанская ШСМ, саўгасы Ружамполь і Нявелічы.

Да Вертінкаўскага куста: Путчынскі, Нарэйкаўскі, Новасадзкі, Байдацкі сельсаветы.

Да Негарэльскага: усе негарэльскія ячэйкі, саўгас Негарэлае, Паланевічы.

Адказны рэдактар—Рэдколегія.

Менск, друкарня імя тав. Сталіна Галоўлітбел № 599